дзіцячых садоў". Ураду і мясцовым органам улады даручана да канца 2020 года гэтыя ды іншыя пытанні дашкольнай адукацыі вырашыць поўнасцю. Разам з тым, для таго каб дашкольная адукацыя была якаснай і даступнай, за апошнія гады ў краіне зроблена нямала. У Беларусі актыўна будуюцца новыя дашкольныя ўстановы. Толькі ў 2016 годзе ўведзена ў эксплуатацыю 12 дзіцячых садоў, у 2017-м — яшчэ 16. Арганізаваны падвоз выхаванцаў, адкрыты групы кароткачасовага знаходжання. У комплексе беларуская дашкольная адукацыя не мае аналагаў у свеце: яна ў асноўным бясплатная, усе маюць роўны доступ да яе.



БЕЛТА

## Пра аплату працы

Прэзідэнт запатрабаваў дыферэнцыраваць аплату працы ў адукацыі: "Я вам шчыра скажу: настаўнік настаўніку не роўны. Вы гэта ведаеце не горш за мяне. Тады чаму мы стварылі ўраўнілаўку і настаўнікі ў нас заработную плату практычна ўсе атрымліваюць аднолькавую?" Але, з іншага боку, нельга дапусціць значнай розніцы ў зарплаце ў настаўніка са стажам і маладога спецыяліста пры ўмове, што выпускнік ВНУ валодае ўсімі неабходнымі кампетэнцыямі. Аляксандр Лукашэнка даручыў у будучым годзе вырашыць пытанне з памерам зарплат настаўнікаў: "У нас у асноўным адукацыя бясплатная. І мы вялікія грошы ўкладваем у гэта. Вядома, недзе абдзяняем выкладчыка і настаўніка. У іншых краінах усё наадварот: каласальныя грошы за кошт таго, што ўсё платнае, яны трацяць на дапамогу настаўнікам і выкладчыкам. Якім шляхам мы пойдзем? Розныя будуць падыходы".

## Пра выхаванне

"Ці вырашаны ўсе пытанні, якія перашкаджалі педагогу ўкладваць душу ў сваіх выхаванцаў? Раней было шмат нараканняў на высокую загружанасць настаўнікаў неўласцівымі функцыямі. Летась міністэрства запэўніла: прыняты вычарпальны пералік школьнай дакументацыі, пытанне залішняй нагрузкі знята. Аднак мне дакладваюць,

## Меркаванні



**Наталля Баранава, рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта:**

— Прыярытэты далейшага развіцця адукацыі расстаўлены правільна, цяпер важна не памыліцца ў выбары шляхоў іх рэалізацыі. Асаблівую значнасць праведзенаму педсавету надаў удзел Прэзідэнта, які вельмі дакладна абазначыў праблемныя пытанні ў рабоце адукацыйнай сістэмы, а таксама вызначыў асноўныя вектары яе развіцця на перспектыву. Рухацца наперад трэба акуратна, узважваючы рашэнні, якія павінны прыносіць толькі карысць працэсу адукацыі.



**Наталля Каліноўская, дырэктар Брэсцкага абласнога ліцэя імя П.М. Машэрава:**

— Мяне больш за ўсё хвалююць пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі, у першую чаргу профільнага навучання. Для нас важна захаваць тыя напрамкі, па якіх на гэтым этапе ажыццяўляецца вывучэнне асобных прадметаў на павышаным узроўні, паколькі яны запатрабаваныя ў вучняў. У дзяцей павінен заставацца выбар, якія прадметы вывучаць на павышаным узроўні, а якія на базавым, у залежнасці ад схільнасцяў і пераваг, звязаных з далейшым прафесійным самавызначэннем. Пры правядзенні прафарыентацыйнай работы таксама мэтазгодна наладзіць супрацоўніцтва ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з вышэйшай школай. Напрыклад, у нас такі досвед ёсць з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце.



**Уладзімір Шыцько, дырэктар Гарадоцкага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа, заслужаны настаўнік Беларусі:**

— Сёння на хвалі грамадскага абмеркавання тэмы сярэдняй і вышэйшай